

# ПЁТР ІВАНАВІЧ МАЛЯЎКА

## (1956 - 2018)

**З болем і смуткам паведамляем, што 29 ліпеня 2018 года на 63 годзе жыцця скончыўся зямны шлях гродзенскага педагога і літаратуразнаўца, кандыдата філалагічных навук Пятра Іванавіча Маляўкі.**

Аўтарытэтны даследчык беларускай літаратуры, аўтар мноства навуковых прац, Пётр Іванавіч Маляўка адрозніваўся перш за ўсё неардынарнасцю сваіх чалавечых якасцяў, сваім абаяннем, унікальнай непасрэднасцю і непаўторнай сардэчнай цеплынёй. Да яго заўсёды можна было звярнуцца за дапамогай, за парадай, як да вернага сябра. Ён быў гатовы пастаянна дзяліцца сваім жыццёвым вопытам, як мудры бацька. Ад яго часцяком можна было пачуць дасціпны народны жарт, трапны афарызм або цытату з класікаў, а часам і яго ўласныя вершы. Ён валодаў дарам слова не толькі ў сэнсе прамоўніцкага мастацтва. Сваім пранікнёным, задушэўным словам выкладчык набліжаў нас да нашых нацыянальных вытокаў, да крыніц багатай народнай культуры; вяртаў людзям сілы; надаваў веры ў сябе, у гармонію гэтага недасканалага свету. І з яго сыходам недасканаласць свету, зразумела, стане больш адчувальнай… Быць вучнем гэтага сціплага, інтэлігентнага чалавека азначала практычна быць яго сваяком, быць часткай яго самога, плёнам яго прафесійнага сумлення, рэхам яго багатага духоўнага свету. Увесь працоўны і жыццёвы шлях Пятра Іванавіча Маляўкі быў шляхам да Беларусі, да той, якую мы страцілі, і да той, якую будуем. Як і належыць сапраўднаму патрыёту, Пётр Іванавіч не мог уявіць свайго ўласнага лёсу ў адрыве ад лёсу сваёй Радзімы. Таму вобраз сінявокай Беларусі і вобраз яе народа для навукоўца, педагога, асветніка назаўжды сталі дамінантамі вывучэння мастацтва і асновамі выхавання моладзі. Пётр Іванавіч жыва цікавіўся тым, што адбываецца ў сучаснай літаратуры, у літаратурным жыцці Гродзенскай вобласці; быў актыўным членам грамадскага дыскусійнага клуба "Словадром". Ён ніколі не мог дазволіць сабе рэзкасці ў ацэнках, некарэктнасці ў выказваннях. Дыялог пакаленняў і светапоглядаў бачыўся ім толькі на прынцыпах гуманізму і высакароднасці. Таму сёння, калі чулае сэрца Пятра Іванавіча Маляўкі перастала біцца, мы разумеем, што страцілі сапраўднага сябра, шчырага беларуса. Светлая памяць аб гэтым светлым чалавеку назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

**Калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**